# У віхуры рэвалюцыйных падзей

**Рэвалюцыі 1917 года, знакавыя для айчыннай і сусветнай гісторыі, неаднаразова станавіліся прадметам мастацкага асэнсавання. У 1920-я гады пісьменнікі звярталіся да ўвасаблення рэвалюцыйнай тэмы па слядах нядаўніх падзей. У 1960-х – сярэдзіне 1980-х гадоў празаікі таксама накіравалі ўвагу да тэмы рэвалюцыі 1917-га, па-мастацку інтэрпрэтуючы яе ў гістарычнай прозе. Тады ж даследчыкі вылучылі ў літаратуры такую разнавіднасць рамана, як гісторыка-рэвалюцыйны раман.**



**Ганна НАВАСЕЛЬЦАВА, кандыдат філалагічных навук**

Як слушна даводзіць украінскі літаратуразнавец Б. Дзяркач, гісторыка-рэвалюцыйны раман як літаратурны жанр характарызуецца спецыфічным аб'ектам мастацкага даследавання, а таксама адметным тыпам героя: «Гэта або актыўны, свядомы змагар за рэвалюцыйныя ідэалы, загартаваны ў рэвалюцыйнай барацьбе, або стыхійны бунтар, або асоба, якая шукае свой шлях і месца ў рэвалюцыйнай барацьбе» *[1, с. 182]*. «У такім рамане паказваюцца як рэальныя, так і прыдуманыя героі і падзеі, актыўна выкарыстоўваюцца дакументы, а таксама стылізаваныя дакументальныя матэрыялы. Аўтарскае імкненне шматмерна ўвасобіць героя і эпоху ўскладняе мастацкі канфлікт, у аснове якога «выразная сацыяльная дэтэрмінаванасць характараў» *[1, с. 185]*.

У сучасным літаратуразнаўстве выступае палітычны раман, у якім спалучаюцца ўсе характарыстыкі вялікай эпічнай формы, дзе спецыфічным прадметам адлюстравання з'яўляецца палітыка як сацыяльны і ідэалагічны феномен, і які тыпалагічна блізкі да твораў так званай рэвалюцыйнай прозы. Для палітычнага рамана, паводле вядомага ў Азербайджане даследчыка рускай літаратуры С. Гасанава, важна не столькі дакументальнае адлюстраванне падзей, колькі асэнсаванне тых умоў, што зрабілі магчымым узнікненне спецыфічнага грамадскага працэсу або сітуацыі *[2, с. 17]*.

У айчыннай літаратуры першым прысвяціў буйны твор інтэрпрэтацыі грамадскай рэчаіснасці Міхась Зарэцкі, які ў рамане «Сцежкі-дарожкі» (1928) адлюстраваў непасрэдныя ўражанні ўдзельніка і сведкі падзей, зыходзячы з вопыту першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя. Як пераканаўча сцвярджае член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар М. Мушынскі, што «датычыць ідэалагічных установак адносна таго, як трэба паказваць рэвалюцыйнае змаганне, рабочы клас і працоўнае сялянства і ў якіх суадносінах павінны знаходзіцца ў творы сцвярджальна-аптымістычны і крытычны пафас, – гэтыя ўстаноўкі ў 20-я гады яшчэ не мелі дэкрэтыўнага характару» *[3, с. 516]*. Адметная вобразная сістэма рамана М. Зарэцкага: галоўным героем выступае Васіль Лясніцкі, інтэлігент у першым пакаленні, які шукае свой шлях у складанай рэвалюцыйнай рэчаіснасці. Пісьменнік закранае няпростую праблему – адносіны інтэлігенцыі да рэвалюцыі, удзел яе ў рэвалюцыйных пераўтварэннях.

## ПРА АЎТАРА

НАВАСЕЛЬЦАВА Ганна Віктараўна.

Нарадзілася ў г. Віцебску. Скончыла Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава (2006), аспірантуру пры ім (2009).

У 2009–2015 гадах – выкладчык кафедры беларускай літаратуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, з 2015 года – дацэнт гэтай кафедры.

Кандыдат філалагічных навук (2013).

Аўтар больш як 20 навуковых прац, у тым ліку адной манаграфіі.

Сфера навуковых інтарэсаў: жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя.

Міхась Зарэцкі паслядоўна прасочвае ўчынкі свайго героя, раскрывае грамадскую атмасферу 1917 года. Так, рамантычна настроены Лясніцкі шчыра вітае Лютаўскую рэвалюцыю. Але яго першая спроба прыняць непасрэдны ўдзел у рэвалюцыйнай дзейнасці паказана аўтарам у трагікамічным святле. Васіль з сябрамі ўдзельнічае ў маніфестацыі. Семінарыстаў натхняюць чырвоныя штандары, гукі аркестра, яны ідуць паглядзець і паслухаць, але настрой такі, як быццам ідуць насустрач нейкаму ворагу. Калі загучаў жалобны марш, рабочы загадаў хлопцам зняць шапкі. Далейшыя дэталі раскрываюцца пісьменнікам не без іроніі: «Лясніцкі шапкі не здзеў выключна па свайму юнацкаму задзёру, але рабочы, мабыць, не зразумеўшы гэтага, здзеў яму шапку лёгкім ударам далоні па цемю». Зразумела, што за Васіля заступіліся, і «далей у вачах Лясніцкага так прамігнула: абшарпенец з задранымі ўгару нагамі, чырвоны твар, шмат яшчэ твараў і рук, і ўжо ў самым тумане – кнопачкай нос і акуляры на старых добрых вачах» *[4, с. 75]*.

Пісьменнік шырока выкарыстоўвае эмацыянальна напружаны дыялог, які спалучае з прыгодніцкай лініяй і любоўнай інтрыгай. Так, Васіль шчыра захапляецца Раісай, дачкой памешчыка Янава. Адносінам маладых людзей перашкаджае канфлікт сялян і памешчыка за сенажаці, у якім Лясніцкі выступае на баку вяскоўцаў, а Раіса крыўдзіцца за бацьку.

І ўсё ж у стасунках герояў пераважаюць сацыяльныя аспекты. Невыпадкова пісьменнік прасочвае, як пад уплывам бальшавіка Андрэя сяляне вырашаюць захапіць сенажаці. Калі ж у вяскоўцаў адбіраюць скошанае сена, яны грабяць і паляць панскі маёнтак. Васіль не ўхваляе рабунку, імкнецца патушыць агонь, а пасля таго як яму гэта не ўдаецца, галоўны герой адчувае сябе чужым для вёскі, перажывае, што не апраўдаў даверу.

Бальшавік Андрэй – незнаёмы для вяскоўцаў чалавек, але ён аказвае на іх большы ўплыў, чым Васіль: «Добра ўмеў гаварыць Андрэй, знаў, як дадзець да нутра. І напаследак ён так заўладаў усіхнім настроем, што, здаецца, каб узняў ён голас ды крыкнуў – гайда на пана! – дык бы і рынуліся ўсе як адзін. Як кончыў ён гаварыць, зноў у грамадзе была дружная згода, зноў была адна воля, адно імкненне» *[4, с. 159]*. Пры гэтым М. Зарэцкі эпізадычна згадвае, як адзін з сялян называе бальшавікоў баламутамі, у чым выяўляецца недавер да новых ідэй.

Увогуле вобраз Андрэя, перакананага бальшавіка, які больш выяўляе сябе анархістам, неадназначны ў рамане. Ён здольны ўплываць на людзей, урэшце схіляе да сваёй праграмы і ўдумлівага Лясніцкага. Але пісьменнік не стварае яго псіхалагічна пераканаўчага партрэта. Крытыкі і літаратуразнаўцы шмат папракалі аўтара за празмерную рамантызацыю асобы, але, думаецца, майстар слова не ставіў мэту дакументальна ўвасобіць героя і падзею.

Як сведчыць творчы вопыт іншых пісьменнікаў, асобы змагароў, якімі і паказваліся найперш бальшавікі-рэвалюцыянеры, тэндэнцыйна раскрываліся ў рэчышчы паэтызацыі, ідэалізацыі. Творцы больш імкнуліся выявіць заканамернае ў гістарычных рэаліях, панарамна паказаць грамадска-палітычныя, сацыяльныя асаблівасці эпохі, даследаваць суадносіны асобы і часу і пры гэтым спалучалі элементы сацыяльна-бытавой і гістарычнай прозы.

У канцы 1970-х – пачатку 1980-х гадоў выйшлі ў свет раманы «Людзі і маланкі», «Запомнім сябе маладымі» Леаніда Дайнекі. У іх паказ рэвалюцыйнай барацьбы на Беларусі суправаджаўся імкненнем «увасобіць нараджэнне новай рэвалюцыйнай этыкі» *[1, с. 54]*.

«Людзі і маланкі» (1978) – твор, у якім Л. Дайнека ўзнавіў падзеі перыяду Першай сусветнай вайны, час паміж Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі 1917 года, пачатак Грамадзянскай вайны. Раман складаецца з некалькіх разгалінаваных сюжэтных ліній. Іх развіццё вызначаў ход гістарычных падзей, а не характары персанажаў. Родныя браты Кузьма і Антон Радзімовічы апынуліся па розныя бакі ў складанай сацыяльна-грамадскай сітуацыі. Асобаснае станаўленне старэй-

шага з братоў, Кузьмы, пачалося на фронце, а малодшага Антона – у тыле, калі ён разам з бацькамі жыў у вёсцы Чмялі. Сын аканома князя Аркадзь Гайкевіч – сябра Беларускай сацыялістычнай грамады – захапіў сваімі ідэямі Антона, зацікавіў Беларускай радай. Бедныя аднавяскоўцы Радзімовічаў асуджалі палітыку Беларускай рады: «Яна хоча незалежнасці Беларусі, аддзялення ад Расійскай дзяржавы. Ужо аддзяліліся Фінляндыя, Украіна. Хочуць аддзяліць і нас. Але падумайце, што гэта нам дасць, таварышы? Якое жыццё можа абяцаць сялянам і рабочым, якія толькі што скінулі векавы царскі прыгнёт, Беларуская рада?» *[5, с. 201]*.

Гайкевіч папрасіў Антона быць 15 снежня ў Мінску на ўстаноўчым сходзе, удзельнікі якога, у трактоўцы пісьменніка, не мелі адзінай мэты. Балтыйскі матрос Сцяпан Дыдо з абурэннем сказаў Антону: «Балабоняць пра незалежнасць, калі ў мяне трое дзяцей і жонка дома галодныя сядзяць. Незалежнасцю я іх не накармлю. Ім хлеб давай» *[5, с. 284]*. Малады настаўнік Андрэй Новік, родам з сялян, прытрымліваўся іншых поглядаў, чакаў роскввіту Беларусі: «Я – беларус. Я не хачу чужой славы, я буду ствараць сваю» *[5, с. 287]*. Узброеныя салдаты разагналі сход.

У рамане «Запомнім сябе маладымі» (1981) Л. Дайнека расказаў пра выбар, які ў няпросты рэвалюцыйны час паўставаў перад кожным чалавекам. Браты Радзімовічы цяжкімі шляхамі прыйшлі адзін да аднаго, каб пасля будаваць новае жыццё. Пісьменнік робіць спробу асэнсаваць эпоху, рэканструяваць ход гісторыі, выявіць гераічныя матывы ўчынкаў людзей. Важнай задачай ён абраў адлюстраванне народнага характару, які загартоўваецца ў часы вялікіх выпрабаванняў.

Эвалюцыя ў мастацкай інтэрпрэтацыі адносна блізкай гісторыі яскрава выяўляецца ў раманах Генрыха Далідовіча «Пабуджаныя» (1988) і «Свой дом» (1989). У першым творы аўтар яшчэ шырока выкарыстоўваў прыёмы ўвасаблення гісторыі, прынятыя ў савецкай літаратуры. Так, пры аповедзе пра падзеі 1917 года змешчаны дакументальны матэрыял пра дзейнасць масонаў, бальшавікоў, Беларускай сацыялістычнай грамады. Як слушна зазначае літаратуразнавец А. Рагуля, «Г. Далідовіч звяртае ўвагу на трагічны лёс як заснавальнікаў БНР, так і стваральнікаў БССР. Гістарычны змест раманаў Г. Далідовіча абвяргае домыслы сучасных “тэарэтыкаў” пра адсутнасць у беларусаў пасіянарнасці – волі да дзяржаўнай творчасці» *[6, с. 753]*.

Адлюстраванню Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый прысвечаны раман «Пабуджаныя», дзе паказаны прадстаўнікі розных палітычных партый, якім не проста паразумецца. Бадай адзінае, у чым супадаюць погляды эсэраў, меншавікоў, бальшавікоў, дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, гэта ў неабходнасці звергнуць манархію. Аўтар так раскрывае тагачасную грамадскую атмасферу: «Калі паразважаць, дык Мінск быў вельмі цікавы горад сярод губеранскіх гарадоў вялікай расійскай імперыі. Ён нібы лічыўся зацішны, спакойны, але… заўсёды небяспечны. Якраз тут у 1898 годзе адбыўся першы з’езд РСДРП, на самым пачатку гэтага стагоддзя – з’езд Рабочага саюза Літвы і сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага, дзе было ўтворана СДКПіЛ *(Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы – марксісцкая партыя. – Заўвага аўтара)*, а ў 1902 – першы Усерасійскі з’езд сіяністаў…» *[7, с. 169–170]*.

Аднак у 1917 годзе сітуацыя ўскладняецца тым, што Мінск на нейкі час становіцца прыфрантавым горадам. Гэта не магло не адбіцца на грамадскіх настроях. Лютаўская рэвалюцыя актывізуе складаныя, падчас супярэчлівыя, сацыяльныя працэсы. Пісьменнік увасабляе сапраўды абуджаных рэвалюцыйнымі настроямі герояў, сярод якіх цяжка вылучыць галоўнага. Тым не менш у рамане выразна прасочваюцца дзве сюжэтныя лініі, звязаныя з лёсамі заяўленых у папярэднім рамане пісьменніка «Гаспадар-камень» (1984) персанажаў – братоў Алеся і Янкі Нямкевічаў.

У «Пабуджаных» Г. Далідовіч таксама вялікае месца адводзіць даследаванню





М.В. Фрунзэ



псіхалогіі гарадскіх і вясковых беларусаў, інтэлігенцыі і сялянства пачатку XX стагоддзя. Так, Алесь Нямкевіч – інтэлігент у першым пакаленні, носьбіт духоўных сялянскіх традыцый, шчыры прыхільнік беларускага нацыянальнага руху. Ён нечым нагадвае коласаўскага Андрэя Лабановіча, і працягвае партрэтную галерэю інтэлігентаў, якую стваралі беларускія пісьменнікі розных пакаленняў. Алесь паказаны побач з грамадска актыўнымі асобамі: Максімам Лашковічам, Сямёнам Васілевічам, а таксама вядомымі культурнымі і палітычнымі дзеячамі, сярод якіх Цішка Гартны, Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Язэп Дыла і інш.

Настаўнік, прыхільнік навучання на беларускай мове, Нямкевіч арганізуе прыватную школку, з-за чаго трапляе ў турму, а вызвалены з-за кратаў толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Тым не менш гэты герой не паказаны грамадскім актывістам: Нямкевіч, як слушна заўважае Лашковіч, болей маўчыць: ці то плыве па цячэнні, ці то расчараваўся ва ўсім. На гэта Алесь справядліва адказвае, што астатнія гавораць і спрачаюцца зашмат. Як бачым, пісьменнік не ідэалізуе беларускі грамадскі рух, але прасочвае яго прынцыповыя адрозненні ад праграмы бальшавікоў. І гэта не толькі праблема нацыянальнага самавызначэння. У цэлым мала супадаюць светапоглядныя сістэмы дэталёва выпісаных персанажаў – Максіма Лашковіча і земскага служачага Міхайлава, пад такім прозвішчам дзейнічаў рэальны персанаж – вядомы рэвалюцыянер М. Фрунзэ.

Абодва героі прайшлі праз сібірскую высылку, дзе Лашковіч ратаваў Міхайлаву жыццё, цяпер паміж імі ўспыхвае дыскусія, якая ператвараецца ў канфрантацыю. Максім не згодны, што народ павінен сам узяць у свае рукі зямлю, фабрыкі, заводы. Ён даводзіць: гэта – правакацыя, паколькі бальшавікі заклікаюць браць тое, што ўзяць самім нельга, і гэта прывядзе да гвалту. Як вынікае з іх дыскусіі, бальшавікоў не надта цікавяць магчымыя ахвяры. З вобразам рашучага і жорсткага Фрунзэ кантрастуе Максім Лашковіч, які невыпадкова прызнаецца ў размове з Алесем: ён згодны з Дастаеўскім у тым, што зло хаваецца ў чалавеку глыбей, чым думаюць многія рэвалюцыянеры, а таму трэба не штурхаць да бойкі, а найперш выхоўваць у людзях «Міласэрнасць, Любоў і Дабрыню» *[7, с. 301]*.

Празаік падрабязна адлюстраваў погляды ў так званым беларускім пытанні А. Мяснікова, М. Крывашэіна, К. Ландэра, І. Алібегава, Б. Позерна і іншых тагачасных палітычных дзеячаў. Асобую ролю пры гэтым ён адвёў Міхайлаву (М. Фрунзэ), які, паводле сцвярджэння пісьменніка, не адхіляе нацыянальныя лозунгі, але аддае перавагу класавым. Генрых Далідовіч паказвае героя як неардынарнага чалавека «з вялікім душэўным агнём, з надзвычай пільным і разумным позіркам» *[7, с. 240]*. Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі ў Петраградзе Міхайлаў ставіць задачу перад мінскімі бальшавікамі: утварыць Мінскі Савет рабочых дэпутатаў і стаць яго лідарамі, тады як у Петраградзе большасць месцаў у Савеце належала меншавікам і эсэрам. Ён раззбройвае паліцыю, і іншыя палітычныя партыі мусяць з гэтым пагадзіцца. Герой і далей пераконвае сваіх паплечнікаў: «Будзем рабіць усё хутка, шчыра, пераканаўча – рабочыя пойдуць за намі. Калі ж, паўтару, пачнём вычэкваць, траціць час на ўзгадненні – упусцім спрыяльны момант…» *[7, с. 242]*. Пісьменнік па-мастацку рэканструюе вобраз, акцэнтуе ўвагу на тым, як у рэдкія хвіліны сумненняў герой вызнае прынцып: смелымі, удачлівымі не нараджаюцца, імі якраз становяцца. Погляды М. Фрунзэ ў творы супрацьпастаўлены пазіцыі К. Ландэра, які заклікаў беларусаў паглыбіць нацыянальныя пачуцці да такой ступені, каб пераўтварыць іх у інтэрнацыянальныя.

Ствараючы вобраз знакамітага рэвалюцыйнага дзеяча М. Фрунзэ, Г. Далідовіч не толькі абапіраўся на факты, але і не адмовіўся ад пэўнай рамантызацыі свайго героя. Надзвычай заўважальная ў творы тэндэнцыя да дэгераізацыі бальшавікоў і асобных дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху. Асабліва яскрава гэта

выяўляецца пры апісанні Беларускага з'езда, на які прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху ўскладаюць вялікія надзеі. Пісьменнік праз ацэнкі, выказаныя персанажамі, акцэнтуе ўвагу на тым, што на з'ездзе шмат сацыялістаў, прадстаўлены розныя партыі, а па нацыянальным складзе дэлегатаў пераважаюць беларусы. Дэлегаты прымаюць рэзалюцыю, дзе прызнаюць новую ўладу ў Петраградзе. Далей з'яўляецца неабходнасць стварыць орган краёвай улады ў Беларусі. І хоць на з'ездзе пераважаюць савецкія настроі, узброеныя салдаты на чале з мінскім камендантам М. Крывашэіным разганяюць з'езд, арыштоўваюць яго прэзідыум. К. Ландэр выказвае такое абвінавачванне прадстаўнікам нацыянальнага руху: «Вашы інтэлігенцкія галовы, душы затуманеныя ўсякімі забабонамі, вымысламі, паклёпамі супраць нас, бальшавікоў, – адпаведна, вы цвяроза не мысліце, не разумееце ні сэнсу нашай праграмы, ні сэнсу кастрычніцкага перавароту, бачыце толькі хаос і разбурэнне, якіх цяпер, сапраўды, зашмат» *[7, с. 563]*.

Праблема пераасэнсавання гістарычнай дзейнасці знакамітых асоб атрымае сваё ўвасабленне і ў наступным творы Г. Далідовіча – рамане «Свой дом», які прысвечаны гісторыі абвяшчэння БССР. Тут значная ўвага надаецца вобразам беларускіх дзяржаўных дзеячаў, найперш, Цішкі Гартнага.

На перыферыю сюжэта твора выведзены вобразы пісьменнікаў (М. Багдановіча, З. Бядулі, Я. Купалы, Ядвігіна Ш., К. Каганца, Ф. Шантыра і інш.), мімаходзь згадваецца дзейнасць «Беларускай хаткі» ў Мінску. Раман напоўнены цытатамі з дакументальных крыніц пачатку XX стагоддзя. Дакумент у рамане выступае адначасова сродкам узмацнення праўдзівасці аповеду, формай спасціжэння гістарычнай рэчаіснасці, доказам правамернасці аўтарскай канцэпцыі мінулага. Вобраз гістарычнага часу ствараўся праз насычэнне твора падзеямі, спалучэнне іх гераіка-рамантычнага і рэалістычна-бытавога адлюстравання.

Такім чынам, Міхась Зарэцкі, Леанід Дайнека, Генрых Далідовіч для асэнсавання рэвалюцыйнай рэчаіснасці звяртаюцца да вобраза інтэлігента, які шукае сваё прызначэнне ў новай грамадскай рэчаіснасці, а побач з галоўным героем яны ўвасабляюць свядомага рэвалюцыянера. Міхась Зарэцкі выкарыстоўвае прыгодніцкую лінію, актыўна звяртаецца да мастацкага вымыслу. Па вялікім рахунку, менавіта ён прадвызначыў некаторыя літаратурныя прынцыпы адлюстравання рэвалюцыйнай рэчаіснасці, у прыватнасці, ідэалізацыю вобраза рэвалюцыянера. Творчую традыцыю Максіма Зарэцкага прадоўжылі Леанід Дайнека і Генрых Далідовіч, якія звярнуліся да мастацкай рэканструкцыі рэальных гістарычных падзей, паказалі дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальнага адраджэння, розных палітычных партый. Генрых Далідовіч істотна ўзмацніў і дакументальную абгрунтаванасць аповеду. Пісьменнікі ў сваіх творах паслядоўна перадаюць сацыяльную дэтэрмінаванасць характараў, вылучаюць розныя сюжэтна-тэматычныя лініі, якія дазваляюць прасачыць успрыманне рэвалюцыі як непасрэдна яе ўдзельнікамі, так і шырокімі масамі (звычайна, вяскоўцамі), асэнсоўваюць рэвалюцыйную рэчаіснасць у кантэксце гістарычнай эпохі, таму іх творы цалкам можна назваць не толькі гісторыка-рэвалюцыйнымі, а яшчэ і палітычнымі раманамі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Деркач, Б.Д. Современный историко-революционный роман: (Проблемы поэтики) / Б.Д. Деркач; АН УССР Ин-т лит. им. Т.Г. Шевченко; отв. ред. И.А. Дзеверин. – Киев: Наук. думка, 1989. – 192 с.
2. Гасанов, С.Г. Политический роман в русской литературе XX века: (Становление и особенности развития): автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.01.01 / С.Г. Гасанов; Азерб. пед. ин-т рус. яз. и лит. – Баку, 1992. – 23 с.
3. Мушынскі, М.І. Міхась Зарэцкі / М.І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, В.А. Каваленка. – Мінск: Беларуская навука, 2002. – Т. 2. – С. 504–549.
4. Зарэцкі, М. Сцежкі-дарожкі / М. Зарэцкі // Збор твораў: у 4 т. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1989–1992. – Т. 2: Голы звер: аповесць. Сцежкі-дарожкі: раман. – 1990.
5. Дайнека, Л. Людзі і маланкі / Л. Дайнека. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – 368 с.
6. Рагуля, А.У. Генрых Далідовіч / А.У. Рагуля // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – Т. 4. – Кн. 3. – С. 737–776.
7. Далідовіч, Г. Пабуджаныя / Г. Далідовіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1988. – 567 с.